Весці БДПУ. Серыя 1. 2022. № 3. С. 103–106

УДК 81'37

# ТЭРМІН *ДРУГАСНАЯ НАМІНАЦЫЯ* Ў СУЧАСНАЙ ЛІНГВІСТЫЧНАЙ ТЭРМІНАСІСТЭМЕ

**А. С. Васілеўская,**
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка*

UDC 81'37

# THE TERM *SECONDARY NOMINATION* IN MODERN LINGUISTIC TERM SYSTEM

**E. Vasilevskaya,**
*PhD in Philology, Associate Professor, Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank*

Паступіў у рэдакцыю 16.08.22.

Received on 16.08.22.

У артыкуле на аснове тэарэтычнага аналізу навуковай літаратуры разглядаюцца розныя падыходы да акрэслення тэрмінаў *намінацыя, першасная намінацыя, другасная намінацыя,* іх суаднесенасці паміж сабой. Аўтар размяжоўвае выпадкі сінаніміі тэрмінаў, робіць спробу стварыць несупярэчлівую іерархію тэрмінаў сферы намінацыі, акрэсліць у гэтай сістэме месца тэрміналагічнага словазлучэння *другасная намінацыя.*

*Ключавыя словы:* намінацыя; першасная намінацыя; другасная намінацыя; ускосная намінацыя; паўторная намінацыя.

On the base of theoretical analysis of scientific literature the article considers various approaches to defining the terms nomination, primary nomination, secondary nomination, their interrelations. The author differentiates the cases of terms synonymy, makes an attempt to create a non-controversial hierarchy of terms in the sphere of nomination, define the place of terminological word combination secondary nomination in this system.

*Keywords:* nomination, primary nomination, secondary nomination, indirect nomination, repetitive nomination.

Універсальнасць мовы як знакавай сістэмы заключаецца ў тым, што яна здольная пры дапамозе абмежаванай колькасці знакаў стварыць практычна неабмежаваную колькасць паведамленняў. Гэта здольнасць звязана з асіметрыяй слоўнага знака: адсутнасцю адпаведнасці паміж большым па аб'ёме і шматмерным па структуры планам зместу і больш простым і меншым па колькасці адзінак планам выражэння [1, с. 89]. Таму нашы веды пра свет выражаюцца ў моўных адзінках, многія з якіх валодаюць здольнасцю перадаваць некалькі значэнняў, інакш кажучы, выступаць у якасці розных адзінак намінацыі [25, с. 5].

Пастаянныя змены сацыяльна-гістарычных умоў жыцця, з'яўленне новых рэалій, развіццё навукі і тэхнікі прыводзіць да змен лексічнага складу мовы. Таму, як адзначаў У. Р. Гак, у мове адбываюцца змяненні суадносін паміж моўнай формай і абазначанай ёй элементам пазамоўнай рэчаіснасці: новыя моўныя сродкі прыстасоўваюцца для абазначэння вядомых рэалій, існуючыя моўныя сродкі – для абазначэння іншай рэаліі, з'яўляюцца новыя словы для абазначэння новай рэаліі. У выніку падобных працэсаў або з'яўляюцца новыя словы, або мяняюцца значэнні моўных адзінак [5, с. 28]. Называнне іменем якоганебудзь прадмета навакольнага асяроддзя і стварае сутнасць акта намінацыі [13, с. 33].

Праблемы намінацыі цікавяць не толькі лінгвістаў, але і філосафаў, логікаў, псіхолагаў, пра што сведчыць дастаткова вялікая колькасць навуковых даследаванняў. Аднак моўная намінацыя па-ранейшаму застаецца не вывучанай да канца з'явай.

Першае, на што неабходна звярнуць увагу, гэта мнагазначнасць тэрміна. У лінгвістычнай літаратуры словам *намінацыя* абазначаецца як працэс называння з'явы рэчаіснасці, прадмета, прыкметы і інш., так і вынік гэтага працэсу. Так, В. М. Тэлія пад намінацыяй разумее «ўтварэнне моўных адзінак, якія характарызуюцца ***намінатыўнай*** функцыяй, інакш кажучы, якія служаць для называння і вычлянення фрагментаў рэчаіснасці і фарміравання адпаведных паняццяў пра іх у форме слоў, спалучэнняў слоў, фразеалагізмаў і сказаў», і далей адзначае: «Гэтым тэрмінам абазначаюць і вынік працэсу намінацыі – значымую моўную адзінку» [22, с. 336]. У гэтым родзе трактуецца тэрмін ***намінацыя*** і ў беларускай лінгвістыцы: «Намінацыя – утварэнне моўных адзінак, якія рэпрэзентуюць у семантыцы мовы і свядомасці чалавека класы предметаў, адносін, што маюць месца ў рэчаіснасці», «вынік працэсу намінацыі – значымая моўная адзінка» [14, с. 138].

Магчымым шляхам пазбегнуць мнагазначнасці тэрміна можа стаць увядзенне ў актыўны навуковы ўжытак тэрміна ***намінат*** – моўная адзінка, вынік акта намінацыі [2]. Размежаванне працэсу і выніку дапаможа пазбегнуць тэрміналагічнай блытаніны, якая нярэдка ўзнікае ў лінгвістычных працах.

Па-ранейшаму адкрытым у лінгвістыцы застаецца пытанне пра віды намінатыўных адзінак. Традыцыйна да іх адносяцца словы і фразеалагізмы. Але ўсё часцей вучоныя кажуць пра тое, што «… намінацыя не форма, а функцыя, і таму яна не можа быць зведзена да слова. Акрамя слова яна прымае аблічча словазлучэння, сказа і цэлага тэксту» [15, с. 23]. Па меркаванні Г. У. Калшанскага, «лексічная намінацыя складае толькі элемент сэнсу паведамлення, сам жа сэнс перадаецца не толькі ў граматычнай структуры, а менавіта ў сінтаксічнай намінацыі» [11, с. 24]. Такія намінацыі вучоны называе *сітуацыйнымі.*

Розныя падыходы існуюць і пры вызначэнні відаў намінацыі. Так, У. Р. Гак стварае разгалі-

наваную «тыпалогію тыпалогій» намінацый на аснове цэлага шэрага аспектаў: функцыі намінацый, структуры наймення, спосабу наймення і інш. [4].

Мэта артыкула – стварыць несупярэчлівую іерархію тэрмінаў сферы намінацыі і акрэсліць у гэтай сістэме месца тэрміналагічнага словазлучэння ***другасная намінацыя***.

Разглядаючы разнастайныя аспекты намінацыі, даследчыкі нярэдка акцэнтуюць увагу на яе абагульняльнай ролі. Г. У. Калшанскі акрэслівае тэрмін як «замацаванне за моўным знакам паняцця – сігніфіката, які адлюстроўвае пэўныя прыметы дэната – уласцівасці, якасці і адносіны – прадметаў і працэсаў матэрыяльнай і духоўнай сферы, дзякуючы чаму моўныя адзінкі ўтвараюць змястоўныя элементы вербальнай камунікацыі» [10, с. 101].

Падобнай думкі прытрымліваецца і У. Р. Гак, які сцвярджае, што акт намінацыі цесна звязаны з актам класіфікацыі [2, с. 76] і ў працэсе намінацыі ўстанаўліваецца адпаведнасць паміж найменнем і паняццем [3, с. 13].

Такім чынам, намінацыя цесна звязана з працэсам пазнання і мае дзейнасны характар: «Найменне прадмета з дапамогай славеснага знака ёсць перш за ўсё ўказанне на тую істотную і размежавальную прыкмету, якая аддзяляе адзін прадмет ад іншых» [10, с. 113].

Тыпалогія намінацый у першую чаргу ствараецца ў межах апазіцыі ***першасная намінацыя – другасная намінацыя***.

У сучасных мовах першасная намінацыя – з'ява дастаткова рэдкая і ўзнікае «толькі тады, калі з'яўляецца магчымасць з дапамогай якой-небудзь формы (элемента) мовы аднавіць у свядомасці той ці іншы прадмет у прасторы» [24, с. 25]. З пункту гледжання анамасіялогіі першасная намінацыя – «акт прысваення імя прадмету, які яшчэ не мае свайго моўнага абазначэння» [9, с. 50].

Найчасцей лексічны фонд той ці іншай мовы папаўняецца за кошт другасных наміцый. Аднак аб'ём гэтага тэрміна акрэсліваецца вучонымі па-рознаму.

Можна адзначыць, што ў навуковай літаратуры існуе два падыходы да азначэння паняцця *другасная намінацыя* – вузкі і шырокі. Пры шырокім разуменні другасная намінацыя акрэсліваецца як выкарыстанне ў акце намінацыі фанетычнага аблічча адзінкі, што ўжо існуе ў мове, у якасці імені для новага абазначаемага [21, с. 336]. У вузкім значэнні другасная намінацыя разглядаецца як з'ява, аналагічная семантычнай дэрывацыі – пераасэнсаванне намінатыўных сродкаў, якія існуць у мове [7, с. 229].

Прыхільнікі шырокага і вузкага падыходу ёсць і ў беларускай лінгвістыцы. Так, Л. І. Сямешка называе другаснай «любыя вытворныя найменні, што ўзнікаюць на розных узроўнях моўнай сістэмы на базе наяўных у мове сродкаў» [20, с. 374]. В. Д. Старычонак лічыць, што «семантычныя дэрываты і другасныя намінаты па сутнасці з'яўляюцца сінанімічнымі выразамі» [18, с. 20].

Мы лічым больш лагічным і тэрміналагічна апраўданым разглядаць паняцце ***другаснай намінацыі*** ў шырокім сэнсе. Менавіта такі падыход дазваляе аб'яднаць у адну групу усе моўныя адзінкі, якія ствараюцца на аснове выкарыстання ўжо існуючых матэрыяльных моўных элементаў [9, с. 50].

Другасныя моўныя адзінкі могуць стварацца на аснове элементаў сваёй або іншай мовы. У апошнім выпадку мы маем справу з запазычаннем або калькаваннем, якія з'яўляюцца дастаткова актыўным спосабам папаўнення лексічнага складу той ці іншай мовы і выступаюць як адметны спосаб намінацыі [16, с. 152].

Утварэнне другасных моўных адзінак з апорай на моўныя элементы сваёй мовы можа адбывацца двума шляхамі – стварэннем фармальна новай адзінкі і ўжываннем слова ў новай семантычнай функцыі [9, с. 53].

Фармальна новая другасная моўная адзінка можа ўзнікаць, напрыклад, у выніку словаўтварэння, якое, па меркаванні А. С. Кубраковай, трэба разглядаць як сістэму мадэлявання другасных адзінак намінацыі са статусам слова [12, с. 13]. У. Р. Гак вылучае другасныя намінацыі (у яго тэрміналогіі ўскосныя) на ўсіх узроўнях моўнай сістэмы – у лексіцы, марфеміцы і сінтаксісе [3, с. 21].

У любым выпадку вынікам другаснай намінацыі з'яўляецца вытворная адзінка, тлумачэнне якой даецца праз іншае, аднакаранёвае з ёй утварэнне [13, с. 23].

Трактоўка паняцця ***другасная намінацыя*** ў шырокім сэнсе дазваляе пазбегнуць з'яўлення непажаданай сінаніміі ў тэрміналагічнай сістэме, што назіраецца ў навуковай літаратуры: сінонімамі да тэрміна ***другасная намінацыя***, акрамя згаданага словазлучэння *семантычная дэрывацыя, выступаюць ускосная намінацыя, семантычнае вар'іраванне, двукратная рэпрэзентацыя, двайное азначванне, паўторная намінацыя, паўторнае кадзіраванне, рэнаміналізацыя, карэферэнцыя, гетэранамінатыўнасць* [23, с. 90]. Для таго, каб стварыць несупярэчлівую сістэму тэрмінаў, неабходна размежаваць гэтыя паняцці.

Словазлучэнне *ўскосная намінацыя* ўжывае ў сваіх працах У. Р. Гак як сінонім да тэрміна *другасная намінацыя*. Такое ўжыванне прыводзіць да з'яўлення непажаданай аманіміі з тэрмінам, уведзеным В. М. Тэліяй, якая ўскоснай (або неаўтаномнай) намінацыяй называе другасныя моўныя адзінкі, якія «характарызуюцца сінсемантычнасцю, г. зн. рэалізуюцца толькі ў спалучэнні з іншымі словамі, адно з якіх з'яўляецца апорным (яно выражае асноўны змест), а другое – падпарадкавальным» [19, с. 164]. Такім чынам, два тэрміны характарызуюць розныя аспекты акта намінацыі: у азначэнні У. Р. Гака – гэта працэс, у азначэнні В. М. Тэліі – гэта вынік акта намінацыі.

Дастаткова часта ў лінгвістычнай літаратуры атаясамліваюцца паняцці *другасная* і *паўторная намінацыя.* Магчыма, такі падыход звязаны з азначэннем А. Ф. Жураўлёва, які лічыць, што з пункту гледжання анамасіялогіі *другасная намінацыя* – гэта «называнне новым іменем прадмета, ужо названага» [9, с. 50]. Аналіз прац вучоных –

прыхільнікаў такога падыходу паказвае, што гаворка ў іх ідзе пра паўторную намінацыю. Паўторная намінацыя характэрна толькі для маўлення (у той час як у выніку другаснай намінацыі могуць ствараеца адзінкі мовы) і ўяўляе сабой найменне «ужо раней абазначанага ў дадзеным кантэксце дэнатата асобы, прадмета, дзеяння, якасці» [6, с. 164]. Тэрміны *двукратная рэпрэзентацыя, паўторнае кадзіраванне, рэнаміналізацыя, карэферэнцыя, гетэранамінатыўнасць* карэліруюць з паняццем *паўторная намінацыя* і служаць для новага абазначэння аб'екта ў тэксце або нават у «звыштэксце». Менавіта ў такім аспекце разглядаецца, напрыклад, паняцце *гетэранамінатыўнасць*: «Пад гетэранамінатыўнымі ўласцівасцямі … разумеюцца характарыстыкі аднаго аб'екта, пакладзеныя ў аснову яго наймення і разгледжаныя ва ўмовах звыштэкставай сукупнасці абазначэнняў» [8, с. 4].

Тэрмін *семантычнае (або лексіка-семантычнае) вар'іраванне* характарызуецца больш вузкай сферай ужывання і служыць для апісання лексіка-семантычных варыянтаў мнагазначных слоў [17, с. 136].

Такім чынам, праведзены аналіз навуковай літаратуры дае магчымасць стварыць, на наш погляд, дастаткова стройную іерархію тэрмінаў. Тэрмін *намінацыя* разглядаецца як працэс утварэння моўных адзінак, якія замацоўваюць уласцівасці, якасці і адносіны прадметаў і працэсаў матэрыяльнай і духоўнай сферы. Асноўнымі відамі намінацыі з'яўляюцца *першасная* і *другасная*. ***Першасная намінацыя*** ўяўляе сабой замацаванне за прадметам у якасці назвы новага гукавога комплексу. ***Другасная*** – утварэнне вытворных намінатаў на аснове ўжо існуючых моўных адзінак. Віды другаснай намінацый адрозніваюцца, у першую чаргу, у залежнасці ад таго, адзінкі якой мовы сталі асновай для з'яўлення новага наміната. Запазычанні і калькі з'яўляюцца на аснове выкарыстання элементаў іншых моў. Вытворныя моўныя адзінкі, якія з'яўляюцца на аснове элементаў сваёй мовы, утвараюцца ў выніку розных відаў дэрывацыі – семантычнай, словаўтваральнай, сінтаксічнай і інш.


*Літаратура*

1. *Азнаурова, Э. С.* Стилистический аспект номинации словом как единицей речи / Э. С. Азнаурова // Языковая номинация (виды номинация). – М. : Наука, 1977. – С. 86–128.
2. *Гак, В. Г.* К диалектике семантических отношений в языке / В. Г. Гак // Принципы и методы семантических исследований. – М. : Наука, 1976. – С. 73–92.
3. *Гак, В. Г.* К проблеме соотношения языка и действительности / В. Г. Гак // Вопросы языкознания. – 1972. – № 5. – С. 12–22.
4. *Гак, В. Г.* К типологии лексических номинаций / В. Г. Гак // Языковая номинация (общие вопросы). – М. : Наука, 1977. – С. 230–293.
5. *Гак, В. Г.* К эволюции способов речевой номинации / В. Г. Гак // Вопросы языкознания. – 1985. – № 4. – С. 28–42.
6. *Гак, В. Г.* Языковые преобразования. Виды языковых преобразований. Факторы и сфера реализации / В. Г. Гак. – М. : ЛИБРОКОМ, 2016. – 408 с.
7. *Громыхина, А. А.* Вторичные наименования в системе номинативных единиц языка [Электронный ресурс] / А. А. Громыхина. – Режим доступа: https://cyberleninka.ru/article/n/vtorichnye-naimenovaniya-v-sisteme-nominativnyh-edinits-yazyka/viewer. – Дата доступа: 22.06.2022.
8. *Громыхина, А. А.* Гетерономинативная специфика вторичных номинаций топонимического объекта «Волгоград» в текстах региональных СМИ : автореф. дис. … канд. филол. наук : 10.02.01 / А. А. Громыхина ; Волгоград. гос. ун-т. – Волгоград, 2012. – 21 с.
9. *Журавлев, А. Ф.* Технические возможности русского языка в области предметной номинации / А. Ф. Журавлев // Способы номинации в современном русском языке. – М. : Наука, 1982. – С. 45–109.
10. *Колшанский, Г. В.* Лингво-гносеологические основы языковой номинации / Г. В. Колшанский // Языковая номинация (общие вопросы). – М. : Наука, 1977. – С. 99–146.
11. *Колшанский, Г. В.* Некоторые вопросы семантики языка в гносеологическом аспекте / Г. В. Колшанский // Принципы и методы семантических исследований. – М. : Наука, 1976. – С. 5– 31.
12. *Кубрякова, Е. С. О* номинативном компоненте речевой деятельности / Е. С. Кубрякова // Вопросы языкознания. – 1984. – № 4. – С. 13–22.
13. *Кубрякова, Е. С.* Теория номинации и словообразование / Е. С. Кубрякова. – изд. 3-е. – М. : URSS : Либроком, 2012. – 83 с.

*References*

1. *Aznaurova, E. S.* Stilisticheskij aspekt nominacii slovom kak edinicej rechi / E. S. Aznaurova // Yazykovaya nominaciya (vidy nominaciya). – M. : Nauka, 1977. – S. 86–128.
2. *Gak, V. G.* K dialektike semanticheskih otnoshenij v yazyke / V. G. Gak // Principy i metody semanticheskih issledovanij. – M. : Nauka, 1976. – S. 73–92.
3. *Gak, V. G.* K probleme sootnosheniya yazyka i dejstvitel'nosti / V. G. Gak // Voprosy yazykoznaniya. – 1972. – № 5. – S. 12–22.
4. *Gak, V. G.* K tipologii leksicheskih nominacij / V. G. Gak // Yazykovaya nominaciya (obshchie voprosy). – M. : Nauka, 1977. – S. 230–293.
5. *Gak, V. G.* K evolyucii sposobov rechevoj nominacii / V. G. Gak // Voprosy yazykoznaniya. – 1985. – № 4. – S. 28–42.
6. *Gak, V. G.* Yazykovye preobrazovaniya. Vidy yazykovyh preobrazovanij. Faktory i sfera realizacii / V. G. Gak. – M. : LIBROKOM, 2016. – 408 s.
7. *Gromyhina, A. A.* Vtorichnye naimenovaniya v sisteme nominativnyh edinic yazyka [Elektronnyj resurs] / A. A. Gromyhina. – Rezhim dostupa: https://cyberleninka.ru/article/n/vtorichnye-naimenovaniya-v-sisteme-nominativnyh-edinits-yazyka/viewer. – Data dostupa: 22.06.2022.
8. *Gromyhina, A. A.* Geteronominativnaya specifika vtorichnyh nominacij toponimicheskogo ob"ekta «Volgograd» v tekstah regional'nyh SMI : avtoref. dis. … kand. filol. nauk : 10.02.01 / A. A. Gromyhina ; Volgograd. gos. un-t. – Volgograd, 2012. – 21 s.
9. *Zhuravlev, A. F.* Tekhnicheskie vozmozhnosti russkogo yazyka v oblasti predmetnoj nominacii / A. F. Zhuravlev // Sposoby nominacii v sovremennom russkom yazyke. – M. : Nauka, 1982. – S. 45–109.
10. *Kolshanskij, G. V.* Lingvo-gnoseologicheskie osnovy yazykovoj nominacii / G. V. Kolshanskij // Yazykovaya nominaciya (obshchie voprosy). – M. : Nauka, 1977. – S. 99–146.
11. *Kolshanskij, G. V.* Nekotorye voprosy semantiki yazyka v gnoseologicheskom aspekte / G. V. Kolshanskij // Principy i metody semanticheskih issledovanij. – M. : Nauka, 1976. – S. 5– 31.
12. *Kubryakova, E. S.* O nominativnom komponente rechevoj deyatel'nosti / E. S. Kubryakova // Voprosy yazykoznaniya. – 1984. – № 4. – S. 13–22.
13. *Kubryakova, E. S.* Teoriya nominacii i slovoobrazovanie / E. S. Kubryakova. – izd. 3-e. – M. : URSS : Librokom, 2012. – 83 s.

14. *Міхневіч, А. Я.* Намінацыя / А. Я. Міхневіч // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / Беларуская энцыклапедыя. – Мінск : БелЭн, 2000. – Т. 11. – С. 138.
15. *Мурзин, Л. Н.* О деривационных механизмах текстообразования / Л. Н. Мурзин // Теоретические аспекты деривации : межвузов. сб. научн. тр. – Пермь : ПГУ, 1982. – С. 20–29.
16. *Серебренников, Б. А.* Номинация и проблема выбора / Б. А. Серебренников // Языковая номинация (общие вопросы). – М. : Наука, 1977. – С. 147–187.
17. *Солошенко, М. А.* Когнитивные основания лексико-семантического варьирования в семантике английского глагола (на примере глаголов feel, sense, perceive) [Электронный ресурс] / М. А. Солошенко. – Режим доступа: https://elib.bsu.by/bitstream/123456789/217697/1/135-140.pdf. – Дата доступа: 22.06.2022.
18. *Старычонак, В. Д.* Мнагазначнасць слова ў беларускай мове : у 3 кн. / В. Д. Старычонак. – Мінск : Кологрaд, 2017. – Кн. 1. Асноўныя тыпы полісеміі, кірункі семантычнай дэрывацыі. – 273 с.
19. *Старычонак, В. Д*. Другасныя іменныя намінацыі (на матэрыяле твораў беларускай літаратуры) / В. Д. Старычонак // Полымя. – 2011. – № 9. – С. 163–177.
20. *Сямешка, Л. І.* Намінацыя / Л. І. Сямешка // Беларуская мова : энцыклапедыя / пад рэд. А. Я. Міхневіча. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 1994. – С. 373–374.
21. *Телия, В. Н.* Вторичная номинация и ее виды / В. Н. Телия // Языковая номинация (виды номинация). – М. : Наука, 1977. – С. 129–221.
22. *Телия, В. Н.* Номинация / В. Н. Телия // Языкознание. Большой энциклопедический словарь / гл. ред. В. Н. Ярцева. – 2-е изд. – М. : Большая Российская энциклопедия, 1998. – С. 336–337.
23. *Уразметова, А. В.* Топонимическая система США: первичная и вторичная номинация / А. В. Уразуметова. – М. : ФЛИНТА: Наука, 2017. – 188 с.
24. Лингвистическая сущность и аспекты номинации / А. А. Уфимцева [и др.] // Языковая номинация (общие вопросы). – М. : Наука, 1977. – С. 7–98.
25. *Шмелев, Д. Н.* Введение / Д. Н. Шмелев // Способы номинации в современном русском языке. – М. : Наука, 1982. – С. 3–14.

14. *Mihnevich, A. Ya.* Naminacyya / A. Ya. Mihnevich // Belaruskaya encyklapedyya : u 18 t. / Belaruskaya encyklapedyya. – Minsk : BelEn, 2000. – T. 11. – S. 138.
15. *Murzin, L. N.* O derivacionnyh mekhanizmah tekstoobrazovaniya / L. N. Murzin // Teoreticheskie aspekty derivacii : mezhvuzov. sb. nauchn. tr. – Perm' : PGU, 1982. – S. 20–29.
16. *Serebrennikov, B. A.* Nominaciya i problema vybora / B. A. Serebrennikov // Yazykovaya nominaciya (obshchie voprosy). – M. : Nauka, 1977. – S. 147–187.
17. *Soloshenko, M. A.* Kognitivnye osnovaniya leksiko-semanticheskogo var'irovaniya v semantike anglijskogo glagola (na primere glagolov feel, sense, perceive) [Elektronnyj resurs] / M. A. Soloshenko. – Rezhim dostupa: https://elib.bsu.by/bitstream/123456789/217697/1/135-140.pdf. – Data dostupa: 22.06.2022.
18. *Starychonak, V. D.* Mnagaznachnasc' slova ÿ belaruskaj move : u 3 kn. / V. D. Starychonak. – Minsk : Kolograd, 2017. – Kn. 1. Asnoÿnyya typy polisemii, kirunki semantychnaj deryvacyi. – 273 s.
19. *Starychonak, V. D.* Drugasnyya imennyya naminacyi (na materyyale tvoraÿ belaruskaj litaratury) / V. D. Starychonak // Polymya. – 2011. – № 9. – S. 163–177.
20. *Syameshka, L. I.* Naminacyya / L. I. Syameshka // Belaruskaya mova : encyklapedyya / pad red. A. Ya. Mihnevicha. – Minsk : Belaruskaya Encyklapedyya, 1994. – S. 373–374.
21. *Teliya, V. N.* Vtorichnaya nominaciya i ee vidy / V. N. Teliya // Yazykovaya nominaciya (vidy nominaciya). – M. : Nauka, 1977. – S. 129–221.
22. *Teliya, V. N.* Nominaciya / V. N. Teliya // Yazykoznanie. Bol'shoj enciklopedicheskij slovar' / gl. red. V. N. Yarceva. – 2-e izd. – M. : Bol'shaya Rossijskaya enciklopediya, 1998. – S. 336–337.
23. *Urazmetova, A. V.* Toponimicheskaya sistema SShA: pervichnaya i vtorichnaya nominaciya / A. V. Urazumetova. – M. : FLINTA: Nauka, 2017. – 188 s.
24. Lingvisticheskaya sushchnost' i aspekty nominacii / A. A. Ufimceva [i dr.] // Yazykovaya nominaciya (obshchie voprosy). – M. : Nauka, 1977. – S. 7–98.
25. *Shmelev, D. N.* Vvedenie / D. N. Shmelev // Sposoby nominacii v sovremennom russkom yazyke. – M. : Nauka, 1982. – S. 3–14.